**«КАСЦЁЛ СВ. АННЫ Ў ВІЛЬНІ»**, верш Б. Датуецца 1911–12. Верш нап. пасля наведвання паэтам Вільні (летам 1911). У 2–4-й строфах услаўляецца незвычайная прыгажосць архітэктурнага збудавання: у ім дамінуе памкнёнасць уверх («да гары», «у вышу неба», «узносіць», «як быццам з грубаю зямлёю расстаўся…»), якая дазваляе не толькі вачам («глядзіш…», у варыянце 11-га радка ў зб. «Вянок паэтычнай спадчыны» 1960 – «і бачыць вока»), але і духу ўслед за вежамі, вастрыямі, за ўсім гмахам касцёла імкнуцца з зямлі ў нябесную далячынь. Першая і пятая, апошняя, строфы верша (невыпадкова амаль поўнае супадзенне ў іх 3-га і 4-га радкоў) згадваюць «пра долі цяжкі глум», пра «сэрца раны», «сцені» і «горач цяжкіх дум». Тут агучаны аўтабіягр. матыў пакут кахання («сэрца раны»), звязаны з Ганнай Какуевай, імя якой паэт («прачытвае» ў вобразе) суадносіць з вобразам «касцёла Анны». Храм з’яўляецца не толькі ўвасабленнем велічы і вышыні духоўных памкненняў веры (у вершы «Цемень» проціпастаўленнем змроку ў душы лірычнага героя выступае «ясны вобраз Хрыста», у варыянце 15-га радка – «Святыня»), але і надзеяй на ўратаванне ад людскіх пакут, зямных нягод, калі душа чалавека дакранаецца да светлага вобраза касцёла св. Анны. Таму выказанае ў 1-м і 2-м радках верша жаданне («Каб залячыць у сэрца раны, забыць пра долі цяжкі глум» спраўджваецца, варта толькі прыйсці да храма «і ціхнуць сэрца раны, і забываеш долі глум»). Скразным матывам, які звязвае 2 планы вобразаў верша, выступаюць матывы замілавання прыгажосцю (чароўнай красы), духоўнай узнёсласці, асвячонасці кахання.

Упершыню — газ. «Беларускі дзень», 1927, № 13, 1 чэрв.; з архіва Р.Зямкевіча.

*Г.Я.Адамовіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ